*...Але паэзія не згасла,*
*Калі ёсць прага бачыць неба,*
*Дзе свеціць зорка непагасна –*
*Жыве ў паэзіі патрэба!*

## МАЯ АКАДЭМІЯ

Светлыя муры на горках цяністых
Полю аратых куюць.
Ведаў не гасне агонь прамяністы:
Класы за парты завуць.
Жыві, акадэмія, ведаў крыніца.
Дазволь, акадэмія, табой ганарыцца…
Белая Русь, хлебам ўволю частуйся,
Быць дабрабыту ў хаце.
З гэтаю мэтай працуй і мацуйся
Мая акадэмія-маці!

## ЛІСТАПАД

Ападае ліства, адлятае,
лёс адзначыў кароткім жыццём.
Ды пагібель яе залатая
быццам жарт над самім небыццём.
Зноў вясною народзіцца цуда –
зелянюткі і кволы лісток.
Гэту радасць ніяк не забуду,
з чысцінёй як бярозавы сок.
І жыццё даўжынёю ў лета,
дзе хапае дажджоў і цяпла…
Так, зялёная песня прапета,
Дзяку Богу, шчаслівай была.

## ПАЧАТАК ЛЕТА

Даўжэюць дні, святлеюць ночы,
у зелені спакой жыве,
перапаўняе ласкай вочы,
кладзецца ценем па траве!
Драбнеюць розныя турботы,
сціхаюць шум і мітусня.
Нарэшце зразумееш, хто ты
І кошт з напоем лета, дня.
Пакуль тут рай і асалода,
не думай зноў пра халады.
Кружэннем поўніцца прырода –
яшчэ мы вернемся сюды.



2020 г.



2017 г.



2013 г.



2012 г.



2009 г.



2008 г.



2007 г.



2005 г.



2003 г.



2002 г.



2001 г.



2000 г.



*Сягаюць думкі да неба,*
*І нават далей – да зор.*
*Такая ў думках патрэба,*
*Такі для думак прастор.*

## ДАРОГА ЖЫЦЦЯ

Як перамена ў дарозе:
угору шлях, а потым уніз,
Час мусіў здацца ў паразе,
надоўга гэта – не капрыз.
Змяняцца дзеям непрыкметна,
і светлы дзень пачне шарэць.
Жыццё яшчэ і тым адметна,
што ўвечар свечцы тут гарэць.
І зразумееш сэнс змянення
ад небыцця ў небыццё,
сярод якіх тваё імгненне,
што называецца жыццё.

## СПРАВЫ ДУШЫ

Калі нахлыне адзінота
(як адляцелі жураўлі),
успомні на хвіліну, што ты
невыпадковы на зямлі.

Табе даручана задача
Трымацца пасярод зімы,
і ў час, калі душа заплача,
яе ты справамі займі.

Жыві надзеяй на вяртанне
І ў час дабра і цеплыні:
там чэрвень, сонечнае ранне…
Магчымасць гэту не міні!

## БУСЛЫ БЕЛАРУСІ

У розных краінах свая асалода,
І я ім пярэчыць зусім не бяруся,
Ёсць сімвал жывы ў любога народа
– Буслы нарадзіліся на Беларусі !...
Як бусел лятае – прыкмета такая,
Шчаслівым на роднай зямлі станаўлюся.
Хай кружыць ды з вока ніяк не знікае
– Я веру, буслы назаўжды ў Беларусі!



*...Божа, магуты мілы,*
*абарані ўсіх людзей.*
*Кожнаму выкрай сілы,*
*не пакідай без надзей...*

“...па сваім характары і светаўспрыманні Алесь Клачкоў – лірык. І лірык своеасаблівы. Ён умее паяднаць у сваім вершы рацыянальнае і эмацыянальнае. І робіць гэта натуральна… Сінтэз гэтых двух пачаткаў аўтару даецца лёгка: ён так мысліць. Менавіта мысліць, бо вершы Алеся Клачкова прымушаюць працаваць і думку, і пачуццё. Над яго вершамі хочацца думаць. Няхай жа гэты одум будзе светлым!...”

Алесь Пісьмянкоў, паэт

“...Паэт шукае. Слова за словам, радок за радком. Ён зусім не прэтэндуе на ісціну ў апошняй інстанцыі, а імкнецца разважаць над кожнай праявай жыцця па-свойму, а заадно падключае да развагі і чытача. Галоўнае для аўтара – каб яго чытач не быў раўнадушны да ўсяго, што адбываецца вакол нас, у свеце...”

Анатоль Зэкаў, паэт

Вера ў цуд ніколі не пакіне нас, бо ў нас ёсць паэты, і сярод іх – Алесь Клачкоў са сваім светам.

Віктар Шніп, паэт

“...Калі чытаю яго вершы, то па незразумелай, здавалася б, прычыне нярэдка плачу. А гэта таму, што пачынаю мяняцца! Мая душа ўспрымае яго вершы як вечны заклік да нечага чыстага, светлага, цудоўнага, што многія мы ўжо згубілі ў нашым жыцці, але што можна яшчэ знайсці сярод звону беларускіх палёў, сярод шэпту беларускіх лясоў, сярод мірнай працы беларускага народа і сярод непрымання беларусамі ўсяго фальшывага і наноснага...”

Андрэй Хамутоў,
доктар філасофскіх навук,
прафессар




“Шукаў
прызначэнне
Сусвету…”

“Дзе толькі мог –
ляцеў і клікаў,
і апошніх сіл
імкнуўся ўгару…”



Абласны фестываль паэзіі
«Буслы над Бесяддзю».
Касцюковічы, 2008 г.



На прэзентацыі кнігі “Колер і гук”. 2009 г.

“З верай у
перамогу жыцця
пойдзем, чаго ты
стаіш?”

“І вера ў цуд
не пакідае
нас…”



Дзень горада. Горкі, 2011 г.



# Палячу ўслед за бусламі...

## Памяці вучонага і паэта АЛЯКСАНДРА КЛАЧКОВА



## (1952 – 2022)

**Светлым воблакам душы**
**Разам з птушкай плывуць,**
**І паверыць зноў мушу:**
**Душы вечна жывуць.**

Бібліятэка імя Д. Р. Новікава УА БДСГА
2022 г.